УДК 811.161.3:[61:001.4]

# АСАБЛІВАСЦІ ПЕРАДАЧЫ НА ПІСЬМЕ ЗАПАЗЫЧАНАЙ МЕДЫЦЫНСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ (ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ)

**Карніеўская Таццяна Анатольеўна**
старшы выкладчык кафедры замежных моў
установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
кандыдат філалагічных навук
(г. Гомель, Беларусь)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Адной з задач сучаснай беларускай лінгвістыкі з'яўляецца ўнармаванне і ўпарадкаванне правіл перадачы тэрміналогіі розных галін навукі ў сістэму беларускай мовы. Трэба адзначыць, што такая работа праводзіцца ўжо даволі працяглы час, але актуальнасць распрацоўкі ўніфікаванай сістэмы правапісу толькі ўзрастае (асабліва ў сувязі з прыняццем ў 2010 годзе новай рэдакцыі Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі). Нам у час работы ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце даволі часта прыходзіцца сутыкацца з неабходнасцю перадачы спецыяльнай лексікі ў сістэму беларускай мовы, таму мы вырашылі абагуліць і выкласці накоплены намі ў дадзенай галіне вопыт.

Мэтай нашага артыкула з'яўляецца разгляд асноўных правіл перадачы запазычанай медыцынскай лексікі ў сістэму беларускай мовы (правапіс галосных літар) з адпаведнымі прыкладамі.

Раздзелы і падраздзелы прынятых у 2010 годзе Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі прыводзяцца намі паводле адпаведнага выдання [4, с. 4–19] (лічбы ў дужках падаюцца згодна з азначанай крыніцай). Правапіс найбольш распаўсюджанай медыцынскай лексікі прыводзіцца згодна з "Беларускім арфаграфічным слоўнікам" [1]. Прыклады спецыялізаванай тэрміналогіі ўзяты з выдання "Тэрміналагічны дапаможнік па прапедэўтыцы ўнутраных хвароб" (ГомДМУ, 2016) [2; 3], пры падрыхтоўцы да выдання якога намі праводзілася кансультаванне.

Такім чынам, найбольш ужывальныя для перадачы медыцынскай лексікі правілы можна выкласці ў наступнай рэдакцыі:

§ 1 (§ 2). Літары *о, ё*

1. Літара *о* пішацца толькі пад націскам: *артро́з, дыспно́э, сіндро́м.*

2. Літара *ё* пішацца пад націскам: *бруцэлёз, педыкулёз, сальманелёз.*

Літара *ё* пішацца не пад націскам у словах з коранем *ёд*: *ёдапірын, ёдаформ.*

3. Калі першая частка складанага слова ўтворана ад назвы хімічнага элемента *радый*, то пішацца літара *е*, якая з'яўляецца злучальнай галоснай:

*радыебіялогія, радыенуклід, радыепратэктары* (у адрозненне ад слоў з часткай *радыё-*: *радыёстанцыя, радыёвяшчанне*).

§ 2 (§ 3). Літары *э, е*:

1. Літара *э* пішацца пасля шыпячых, [р], [д], [т], цвёрдага [ц]: *адэкватны, анестэзія, рэплікацыя, рэцэптар, цэрвікальны.*

2. У пачатку запазычаных слоў літары *э, е* як пад націскам, так і не пад націскам пішуцца ў адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем: *еўгеніка, еўнухаідызм, эндэмічны, эндаскапія.*

На канцы запазычаных нязменных слоў пасля зычных, акрамя *л, к* пішацца *э*: *дражэ.*

3. Літара *э* ў запазычаных словах пасля губных зычных, а таксама пасля *з, с, н* пішацца згодна з літаратурным вымаўленнем: *асептыка, бальнеалогія, бэта-выпраменьванне, метабалізм, сенсібілізцыя, экзэма.*

§ 3 (§ 4). Перадача акання на пісьме:

1 (2). Незалежна ад паходжання слова гук [о] ў ненаціскных складах вымаўляецца як [а], што перадаецца на пісьме: *аблітэрацыя, аклюзія, бранхіт, дэфармацыя, лардоз.*

3 (4). Перадача на пісьме [э] ў іншых запазычаных словах у ненаціскных складах асновы вызначаецца наступнымі правіламі:

у пачатку слова [э] перадаецца на пісьме літарай *э* ў адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем: *энцэфаліт, эпідэміялогія, эрытрацыт, эрытэма, этыялогія*;

пасля шыпячых, [р], [д], [т], і цвёрдага [ц] пішацца *э*: *астэафіт, парэнтэральны, піядэрмія, рэфлекс, тэрапія, цэлюлярны.*

4 (6). Ненаціскныя фіналі *-эль, -эр* у запазычаных словах перадаюцца як *-аль, -ар*: *катэтар.*

§ 4 (§ 6). Перадача якання на пісьме:

1(2). Літара *я* пішацца ў першым складзе перад націскам у некаторых даўно запазычаных словах неславянскага паходжання: *валяр'ян, вянозны.*

2 (3). Заўсёды захоўваецца *е* ў першым складзе перад націскам пасля заднеязычных *г, к, х*: *аналгезія, гемоліз, генетыка, кетонавы, хейліт.*

3*. У большасці запазычаных слоў *е* ў пераднаціскным складзе захоўваецца: *алергія, атэрасклероз, лейкоз, сенільны, ювенільны.*

§ 5 (§ 9). Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах:

1. Калі спалучэнні *іо, йо* вымаўляюцца як два склады, то яны на пісьме абазначаюцца:

паміж зычнымі – літарамі *іё* (*ыё*) пад націскам, літарамі *ія* (*ыя*) не пад націскам: *ангіёма, артэрыёла, бактэрыялогія, біёніка, біяпсія, геліятэрапія, кардыялогія, скаліёз, фізіялагічны, хіміятэрапія, цыяноз*;

у пачатку слова – літарамі *іо* пад націскам і *іа* не пад націскам: *іон, іонны, іанізацыя.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Калі спалучэнні *іо, йо* вымаўляюцца як адзін склад, тады на пісьме яны перадаюцца ў пачатку слова праз *ё*: *ёд, ёдаформ*

3. Спалучэнне *іе* абазначаецца на пісьме літарамі *іе (ые)*: *гігіена, пацыент.*

4 (5). Спалучэнне *іа* абазначаецца на пісьме літарамі *ія* (*ыя*) незалежна ад месца націску: *артэрыяльны, бранхіяльны, гемадыяліз, гіялуронавы, дыягназ, дыягностыка, дыяфрагма.*

5 (6). Спалучэнне *йа* на пісьме перадаецца пасля галосных – праз *я*: *параноя.*

Такім чынам, найбольшую значнасць пры перадачы запазычаных медыцынскіх тэрмінаў (простых паводле структуры) у сістэму беларускай мовы маюць наступныя фанетычныя з'явы: аканне (якое паходзіць з першапачаткова *о*) і спалучэнне галосных. Што тычыцца якання, то разгледжаныя тэрміны па прычыне свайго паходжання часцей за ўсё з'яўляюцца выключэннямі з правіла і захоўваюць найбольш прыбліжаную да арыгінала форму.

**Літаратура**


1. Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад. Л. П. Кунцэвіч, І. У Кандраценя ; пад рэд. А. А. Лукашанца. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 695 с.
2. Друян, Л. И. Терминологическое пособие по пропедевтике внутренних болезней: учеб.-метод. пособие для студентов 2–3 курсов всех факультетов медицинских вузов / Л. И. Друян, А. Л. Калинин. – Гомель: ГомГМУ, 2016. – Ч. 1. – 156 с.
3. Друян, Л. И. Терминологическое пособие по пропедевтике внутренних болезней: учеб.-метод. пособие для студентов 2–3 курсов всех факультетов медицинских вузов / Л. И. Друян, А. Л. Калинин. – Гомель: ГомГМУ, 2016. – Ч. 2. – 84 с.
4. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі : зацверджаны Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. № 420-З. – Мінск : Дыкта, 2009. – 152 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова